Апрача скасавання шлюбу, існавала праблема яго ўзнаўлення. Праваслаўная царква дазваляла ўзнаўленне шлюбу, калі яго скасаванне не мела вынікам царкоўнае пакаранне. Але не дапускалася ўзнаўленне шлюбу пры скасаванні яго з прычыны пастрыжэння мужа або жонкі.

*А.А. Любіч*

БДЭУ (Мінск)

## ПРА НЕКАТОРЫЯ ШЛЯХІ НЕДАПУШЧЭННЯ МАНАПАЛІСТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НА ТАВАРНЫХ РЫНКАХ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Мэта нашай сенняшняй працы — дэманстрацыя магчымых шляхоў стварэння спрыяльнага для грамадства канкурэнтнага асяродка на таварных рынках краіны на аснове станоўчага замежнага вопыту.

Трэба памятаць, што на новым этапе развіцця сусветных гаспадарскіх стасункаў кіруючую ролю адыгрывае канкурэнцыя не кошту, а якасці, менавіта яе патрэбна стымуляваць у першую чаргу.

Усе выпадкі ўзнікнення манапалізма на таварных рынках можна падзяліць на дзве катэгорыі: манаполіі ў вытворчым і ў трэтычным сектарах.

Пачнем з выпадкаў манапалізацыі ў трэтычным сектары эканомікі. Гэты сектар характарызуецца існаваннем на ім мадэлі, што набліжана да закончанай канкурэнцыі. Практычна немагчыма дасягненне прыватнай асобай манапольнага палажэння на такім рынку, бо парог неабходных фінансавых затрат для ўваходжання на яго нязначны, а укладзеныя грошы хутка вяртаюцца з прыбыткам. Адзіны суб'ект гаспадарання, які можа тут стаць манапалістам, выкарыстоўваючы свой асобы статус — гэта дзяржава. Такім чынам, вырашэннем пытання пра недапушчальнасць манапалізацыі з'яўляецца тут раздзяржаўленне. Як паказвае сусветны вопыт, нават камунальны транспарт можа быць аб'ектам раздзяржаўлення. Праблема гэта даволі актуальная, асабліва для Мінска. Праблемы, звязаныя з працай камунальнага транспарта, можна было б вырашыць, стварыўшы канкурэнцыю ў двух напрамках: за кошт актыўнага ўкаранення маршрутных таксі і дзякуючы канцэсаванню (праз дамову франчайзінга) стратных маршрутаў аўтобусаў.

Рынак сыравіны з'яўляецца больш складаным ў гэтых адносінах. Тут да месца было б больш шырокае выкарыстанне інстытута канцэсіі, на што указаў пад час апошняга Паслання да беларускага народа і Нацыянальнага сходу Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь.